большой буквы. Те, у которых нам, современным преподавателям, есть и будет всегда чему поучиться. Изучать, знать, ценить достижения своих предшественников – не только научный, но и нравственный долг каждого исследователя.

## Библиографические ссылки


1. Евтухов, И. О. Кафедра истории древнего мира и средних веков БГУ. К 80-летию создания / И. О. Евтухов. – Минск : БГУ, 2015. – 223 с.
2. Отдел рукописей и редких книг Научной библиотеки имени Лобочевского К(П)ФУ. Фонд 24 (фонд А. С. Шофмана).
3. Ревяко К. А. Пунические войны / К. А. Ревяко. – Мн. : «Университетское», 1988. – 272 с.
4. Садыков М.Ш., Ревяко К.А. Дипломатический аспект предыстории Пунических войн в оценке немецкого антиковедения XX в. // Вестник БГУ. Сер. 3. 1993. N1. С. 10–13.
5. Садыков, Марат Шайхутдинович. Дипломатические взаимоотношения государств Западного Средиземноморья в 323-264 гг. до н. э. : автор. дис. ... канд. исторических наук : 07.00.03 / Казанский ун-т. - Казань, 1998. - 20 с.
6. Сыченкова Л. «Опрокидон с пирамидоном», или Неофициальный портрет Аркадия Шофмана // Республика Татарстан, №167 (27584), 08.11.2013.
7. Шофман А. С. Восточная политика Александра Македонского. – Казань: Изд-во Казан. ун-та, 1976. – 520 с.
8. Шофман А. С. История античной Македонии. Ч. 1: Доэллинистическая Македония. – Казань: Изд-во Казан. ун-та, 1960. – 300 с.
9. Шофман А. С. История античной Македонии. Ч. 2: Македония и Рим. – Казань: Изд-во Казан. ун-та, 1963. – 434 с.
10. Шофман А. С. Очерки по истории Македонии и македонского народа: (С древнейших времен до первой мировой войны) : Курс лекций, прочит. на ист.-филол. фак. Т. 1. / Казан. ордена Трудового Красного Знамени гос. ун-т им. В. И. Ульянова-Ленина. – Казань: Изд-во Казан. ун-та, 1960. – 288 с.
11. Шофман А. С. Очерки по истории Македонии и македонского народа: (С древнейших времен до первой мировой войны) : Курс лекций, прочит. на ист.-филол. фак. Т. 2. / Казан. ордена Трудового Красного Знамени гос. ун-т им. В. И. Ульянова-Ленина. – Казань: Изд-во Казан. ун-та, 1961. – 233 с.
12. Шофман А. С. Распад империи Александра Македонского. – Казань: Изд-во Казан. ун-та, 1984. – 224 с.



**Астрога Віктар Аляксандравіч**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*


# РОЛЯ БДУ Ў ЗАРАДЖЭННІ І РАЗВІЦЦІ СІСТЭМЫ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ МЫТНАЙ СПРАВЫ Ў БЕЛАРУСІ

Роля Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў станаўленні навукі і адукацыі ў Беларусі цяжка перабольшыць. Універсітэт стаў кузняй кадраў для самых розных сфер дзейнасці. Сёння прыйшла чарга адзначыць намаганні яго выкладчыкаў і навукоўцаў у галіне станаўлення і развіцця ў нашай краіне мытнай справы.

У цяперашні час мы можам канстатаваць, што гэтая праблема фактычна не асветлена ў айчыннай гістарыяграфіі, нягледзячы на сваю безумоўную актуальнасць. Тэма шырокая, яна закранае гісторыю фарміравання кадравага патэнцыялу мытных устаноў на тэрыторыі Беларусі фактычна цягам апошніх ста гадоў.

12 студзеня 1922 г. у складзе Упраўлення ўпаўнаважанага Народнага камісарыята знешняга гандлю (НКЗГ) пры ССРБ быў утвораны мытны аддзел. У лік яго задач ўваходзіла і каардынацыя стварэння мытных установ на тэрыторыі Савецкай Беларусі. Праз некаторы час была сфармавала Заходняя мытная акруга (ЗахМА) з упраўленнем у г. Мінску і 9 мытняў. Аднак неўзабаве сярод беларускіх мытнікаў выявіўся значны дэфіцыт прафесійных і проста дастаткова адукаваных кадраў. Так, сярод 465 супрацоўнікаў, з вышэйшай адукацыяй было 6, а з сярэднім 123 чалавекі [1, С. 58]. Для выпраўлення сітуацыі ў студзені 1923 г. начальнік акругі Я.Э. Олін звярнуўся да кіраўніцтва Галоўнага мытнага ўпраўлення НКЗГ СССР з просьбай дазволіць адкрыццё ў Мінску спецыяльных акруговых мытных курсаў «па падрыхтоўцы мытных супрацоўнікаў для правільнага і свядомага выканання мытнай службы», па прыкладзе Маскоўскай і Петраградскай мытняў [2, л. 57]. У адказ быў атрыманы дазвол толькі на кароткатэрміновыя курсы-лекцыі.

Але нават гэтая невялікая магчымасць натхніла мінскіх мытнікаў. За кароткі час намеснік начальніка ЗахМА А.С. Бранавіцкі распрацаваў Палажэнне аб курсах-лекцыях і склаў навучальны план. Акрамя супрацоўнікаў упраўлення акругі і Мінскай мытні ў якасці лектараў было прапанавана прыцягнуць прафесуру Беларускага дзяржаўнага універсітэта [3, л. 57]. Я.Э. Олін лічыў, што курсы павінны быць фундаментальнымі і забяспечыць падрыхтоўку сапраўднага прафесіянала мытнай справы магчыма толькі сумесна з БДУ. Рэктар універсітэта У.І. Пічэта ўхваліў гэтую просьбу. Так, планавалася, што прафесар БДУ В.У. Якунін прачытае аб'яднаны курс «Міжнародная гандлёвая палітыка і ўвядзенне у навуку фінансаў», прафесар С.Я. Вольфсон стане весці лекцыі па палітэканоміі, «Арганізацыю знешняга гандлю ў Расеі» - Ю. Ленскі, а «Элементарны курс міжнароднай гандлёвай палітыкі» - дацэнт І.Я. Герцык [4, л. 69].

Пасля некалькіх пераносаў 1 лістапада 1923 г., пры Мінскай мытні па адрасе - вуліца Петраградская, будынак 6, пачалі працу трохмесячныя мытныя курсы-лекцыі. Сімвалічна, што ў цяперашні час на гэтай жа вуліцы, цяпер Ленінградскай, у будынку № 20 размяшчаецца кафедра мытнай справы ФМА БДУ. Аднак курсы-лекцыі ўжо ў наступным 1924 г. указаннем з глаўка былі зачыненыя. Таму ўдалося падрыхтаваць толькі адну групу кваліфікаваных спецыялістаў.

З канца 1920-х гг. колькасць мытных установ стала хутка скарачацца, і да 1941 г. у БССР мелася толькі адна мытня ў Брэст-Літоўску, дзе працавала каля 20 чалавек. У пасляваенны перыяд павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўка кадраў супрацоўнікаў беларускіх мытняў ажыццяўлялася на спецыяльных курсах пры Рыжскай мытні.

Пасля здабыцця Беларуссю дзяржаўнай незалежнасці, 20 Верасня 1991 г. была створана нацыянальная мытная служба. Новае ведамства адчувала крайні дэфіцыт кадраў. Колькасць супрацоўнікаў мытных органаў трэба было павялічыць з 1500 чалавек да амаль 6000, г.зн. практычна ў чатыры разы. Да прыкладу, з'явілася неабходнасць стварэння і камплектавання зусім новага падраздзелу мытнай службы - экспертнай мытнай лабараторыі. Яна была створана 27 снежня 1993 г. у складзе Мінскай рэгіянальнай мытні як аддзел мытных даследаванняў і экспертыз з мэтай

ўкараненнія экспертыз у практыку мытнага кантролю, узмацненне барацьбы з кантрабандай, незаконным абаротам наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў. Для паспяховага вырашэння гэтай задачы кіраўніцтва Дзяржаўнага мытнага камітэта (ДМК) Рэспублікі Беларусь звярнулася па дапамогу да БДУ. Шэраг выкладчыкаў фізічнага і хімічнага факультэтаў універсітэта адгукнуўся на заклік папоўніць шэрагі мытнай службы. Так, першым начальнікам гэтага аддзела стаў дацэнт фізічнага факультэта кандыдат фізіка-матэматычных навук М.В. Нікановіч. Па цяперашні час у лабараторыі працуе выпускнік хімічнага факультэта кандыдат хімічных навук Ю.С. Палякоў, які таксама доўгі час працаваў яе начальнікам. Адзначым, што і сама мытная лабараторыя да 2006 г. знаходзілася на хімічным факультэце БДУ.

У другой палове 1990-х гг. пачаліся пошукі магчымасцяў для масавай падрыхтоўкі ў рэспубліцы спецыялістаў мытнай справы з вышэйшай адукацыяй. Для нашай краіны на той момант гэта была ўнікальная спецыяльнасць. Зноў, як і больш за 70 гадоў таму, беларуская мытная служба звярнулася да вядучага універсітэту краіны. У 1997 г. кіраўніцтва БДУ падтрымала ініцыятыву Старшыні ДМК В.В. Макарэвіча аб адкрыцці спецыяльнасці «Мытная справа» на ФМА.

Але для пачатку з верасня 1997 г. на гэтым факультэце была адкрыта спецыялізацыя «Эканамічнае забеспячэнне мытнай дзейнасці» ў рамках падрыхтоўкі спецыялістаў па сусветнай эканоміцы і было прынята рашэнне аб адкрыцці ў перспектыве спецыялізаванай магістарскай праграмы [5, С. 17]. Кіраўніцтва мытнай службы лічыла, што забяспечыць выкананне няпростых задач, якія стаялі перад мытнікамі змогуць людзі, якія маюць грунтоўныя веды ў галіне сусветнай эканомікі, авалодалі «сакрэтамі мытнай справы» і валодаюць замежнымі мовамі. Падобныя магчымасці меў у рэспубліцы толькі ФМА БДУ. І як адзначыў напрыканцы 1998 г. адносна гэтага стратэгічнага ўзаемадзеяння А.М. Сіроцкі, будучы загадчык кафедры мытнай справы БДУ, на той час дацэнт кафедры дыпламатычнай і консульскай службы, - «Ёсць надзея, што садружнасць вучоных і практыкаў у ажыццяўленні важнай і неадкладнай задачы па падрыхтоўцы спецыялістаў для беларускай мытні дасць добры плён» [6, С. 18].

Эксперымент прайшоў удала і ў верасні 1999 г. адбыўся першы набор студэнтаў на спецыяльнасць 1-96 01 01 «Мытная справа» з двума спецыялізацыямі: «Прававое забеспячэнне мытнай справы» (для службы ў мытных органах) і «Эканамічны забеспячэнне мытнай справы» (для працы ў сферы мытных паслуг) [7, С. 6]. У далейшым, з верасня 2011 г. на кафедры была адкрыта і трэцяя спецыялізацыя «Мытная лагістыка» (для працы ў сферы міжнароднай лагістыкі). У наступным годзе 28 жніўня 2000 г. загадам рэктара БДУ на ФМА была створана спецыялізаваная кафедра мытнай справы. Яе загадчыкам быў прызначаны кандыдат гістарычных навук, дацэнт А.М. Сіроцкі (2000-2008 гг.), Затым яго змяніў былы супрацоўнік Мінскай цэнтральнай мытні кандыдат гістарычных навук, дацэнт В.А. Астрога (2008 г. па н/ч). Кафедра стала першай, а ў наступным вядучай сярод астатніх профільных кафедраў ва універсітэтах Беларусі. У 2004 быў ажыццёўлены першы выпуск спецыялістаў мытнай справы, пасля сотні выпускнікоў дадзенай спецыяль-

насці з БДУ сталі прафесіяналамі мытнай справы, а асобныя з іх занялі кіруючыя пасады на прадпрыемствах галіны і ў мытных органах.

За ўвесь час свайго існавання кафедра дэманстравала цесныя навучальныя і іншыя прафесійныя сувязі з беларускай мытнай службай, з ДМК і ўсімі мытнямі. Частка выкладчыкаў кафедры з'яўляецца былымі або дзеючымі супрацоўнікамі мытнай службы Беларусі. Не раз кафедра была ініцыятарам буйных адукацыйных і навуковых праектаў у сваёй сферы. Так, у 2003 г. у выдавецтве БДУ выйшаў з друку ўнікальны для рэспублікі фундаментальны падручнік «Асновы мытнага справы», падрыхтаваны аўтарскім калектывам кафедры і ДМК Рэспублікі Беларусь пад рэдакцыяй А.М. Сірочага і намесніка старшыні ДМК Рэспублікі Беларусь У.А. Гошына.

За мінулыя гг. кафедра стала вядучым навучальна-метадычным цэнтрам у сваёй сферы, а яе загадчык з'яўляецца намеснікам старшыні Навукова-метадычнай рады (НМР) па адукацыі ў галіне забеспячэння эканамічнай бяспекі НМА па гуманітарнай адукацыі. У цэлым, падрыхтоўка будучых мытных прафесіяналаў ажыццяўляецца ў рамках Адукацыйнага стандарта 1 ступені вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці «Мытная справа», тыпавых навучальных планаў і навучальных праграм, узгодненых з кіраўніцтвам ДМК Рэспублікі Беларусь. Для ўзмацнення прафесійных магчымасцяў будучых спецыялістаў мытнай справы, кожны са студэнтаў ўвесь перыяд навучання вывучае па 2 замежных мовы, падабраных зыходзячы з перспектыў развіцця мытнай сферы. Да прыкладу, з 2016 г. пачалося вывучэнне кітайскай мовы. Кафедра развівае сваю вучэбна-матэрыяльную базу, якая забяспечвае практычную накіраванасць навучання. Маецца 6 абсталяваных спецыялізаваных кабінетаў.

Неабходна адзначыць, што асабліва руплівa вядзецца праца над падрыхтоўкай лепшых студэнтаў для мытных органаў у рамках спецыялізацыі «Прававое забеспячэнне мытнай справы». У навучальным плане іх спецкурсаў многія дысцыпліны вядуць службовыя асобы мытных органаў. Частка практычных заняткаў праводзіцца на базе мытняў Рэспублікі Беларусь. Студэнты актыўна ўдзельнічаюць у мерапрыемствах, арганізаваных мытнікамі. Адзначым, што па ўзгадненні з Рэктарам БДУ і Старшынёй ДМК Рэспублікі Беларусь з 2014/2015 навуч.г студэнты згаданай спецыялізацыі носяць форму ідэнтычную мытнай з пагонамі і нарукаўным знакам БДУ, што яшчэ больш наблізіла намаганні кафедры ў галіне прафесійнага навучання да патрабаванням мытных органаў. З 2016/2017 нав. г. гэтая спецыялізацыя набыла сваё новае гучанне ў сувязі з пачаткам падрыхтоўкі спецыялістаў для мытнага ведамства па мэтавым накіраванні для службы ў памежных мытнях.

З 2010 г. кафедра па ўсіх напрамках актыўна ўзаемадзейнічае з Дзяржаўным інстытутам павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў мытных органаў Рэспублікі Беларусь. Да прыкладу, выкладчыкі кафедры па нашай ініцыятыве з 2013 г. рэгулярна праходзяць там курсы павышэння кваліфікацыі «Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі мытнай справы».

Вельмі важна для падрыхтоўкі будучага прафесіянала-мытніка выхаваўча-ідэалагічная работа праводзіцца ў рамках планаў БДУ, ФМА і кафедры. Асобныя мерапрыемствы ўзгадняюцца з мытнямі. Асаблівая

ўвага ў гэтай сферы надаецца далучэнню студэнтаў да традыцый мытнай службы Беларусі. З 2008 г. кафедра мае свой геральдычны знак, а з 2018 г. на аддзяленні мытнай справы ФМА для ўмацавання і развіцця традыцый ўведзены курсавыя сцягі. Да прыкладу, цесная і сяброўская сувязь кафедры і мытных органаў была ярка прадэманстравана на ўрачыстым сходзе, прысвечаным 15-годдзю стварэння кафедры (2015 г.). Сярод ганаровых гасцей, выкладчыкаў і студэнтаў павіншавалі начальнікі Мінскай рэгіянальнай мытні А.В. Багдзевіч і мытні «Мінск-2» А.У. Міхалькевіч, начальнік Дзяржаўнага інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў мытных органаў Рэспублікі Беларусь І.І. Дубік [8]. У іншым выпадку, 5 лістапада 2018 г. на пляцоўцы Дзяржаўнага інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў мытных органаў Рэспублікі Беларусь прайшла буйная прафарыентацыйная акцыя «Прафесія мытнік: гісторыя і сучаснасць» [9]. Гісторыка-пазнавальная праграма была падрыхтавана супрацоўнікамі інстытута сумесна з кафедрай для студэнтаў-мытнікаў беларускіх універсітэтаў і супрацоўнікаў мытных органаў і прымеркавана 95-годдзю адкрыцця першых у гісторыі Беларусі курсаў-лекцый пры Мінскай мытні 1923 г. Удзельнікі мерапрыемства пазнаёміліся з унікальнымі гісторыка-дакументальнымі матэрыяламі, прадастаўленымі Нацыянальным архівам Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, якія ілюстравалі гісторыю мытнай службы. Для студэнтаў былі праведзены 8 тэматычных майстар-класаў, падрыхтаваных у форме творчых спаборніцтваў, якія прадстаўлялі магчымасць набыць навыкі непасрэднай працы па розных напрамках дзейнасці мытнай службы. Фіналам акцыі стаў канцэрт, падрыхтаваны сіламі мытнікаў і студэнтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

На кафедры пастаянна вядзецца актыўная навуковая праца выкладчыкаў, аспірантаў, магістрантаў і студэнтаў. Так, кафедра сумесна з ДМК Рэспублікі Беларусь у 2010 г. з'явілася ініцыятарам правядзення традыцыйнай і штогадовай міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Мытны саюз: сучаснасць і перспектывы». З 2014 г. сіламі кафедры на базе ФМА праводзіцца міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Кіраванне ў галіне мытнай справы», дзе заўсёды актыўны ўдзел прымаюць беларускія мытнікі. У цяперашні час калектыў кафедры працуе над прапановамі па фармаванні перспектыўнай тэматыкі навукова-даследчай працы ў інтарэсах мытных органаў Рэспублікі Беларусь.

Удасканаленне ўсіх складнікаў комплексу падрыхтоўкі будучага прафесіянала мытнай справы ў цеснай сувязі з патрэбамі мытных органаў ажыццяўляецца з дапамогай ўдзелу кафедры ў працы згаданага НМР - эфектыўнай пляцоўкі для інавацый у сферы падрыхтоўкі мытных кадраў, дзе праходзяць абмеркаванне і навукова-метадычную апрабацыю рознага кшталту адукацыйныя ідэі і праекты. Менавіта там прадстаўнікі мытнай службы і універсітэтаў сумесна выпрацоўваюць рэкамендацыі па ўдасканаленні навучальнага працэсу, ствараючы сучасную мадэль навучання па спецыяльнасці «Мытная справа». Вельмі важны ўдзел кафедры у працы Грамадска-кансультацыйнага савета пры ДМК Рэспублікі Беларусь, на пасяджэннях якога неаднаразова падымаліся канцэптуальныя

пытанні падрыхтоўкі кадраў. Досвед кафедры мытнай справы ФМА БДУ вывучаецца і выкарыстоўваецца пры падрыхтоўцы спецыялістаў мытнай справы ў БНТУ, БелДУТ, ГрДУ імя Янкі Купалы, БДЭУ. Педагагічныя поспехі выкладчыкаў кафедры, а таксама дасягненні нашых студэнтаў неаднаразова адзначаліся граматамі і нагруднымі знакамі кіраўніцтвам ДМК і мытняў.

Такім чынам, БДУ цяпер, як і ў 1920-я гг., з'яўляецца надзейным партнёрам для нацыянальнай мытнай службы ў справе ўсебаковага фармавання высокапрафесійных спецыялістаў мытнай справы і развіцця навуковых даследаванняў у гэтай сферы. Сёння, на наш погляд, склалася аптымальная арганізацыйная структура па забеспячэнню якаснай падрыхтоўкі спецыялістаў у гэтай галіне, у універсітэцкім блоку якой, вядучым з'яўляецца Беларускі дзяржаўны універсітэт.

### Бібліяграфічныя спасылкі


1. Государственная таможенная служба Республики Беларусь. История и современность. Под общ. ред. А.Ф. Шпилевского. – Минск: Белтаможсервис, 2006. – 248 с.
2. Протоколы технического совещания при управлении Западного таможенного округа (4 февраля – 28 декабря 1923 г.) // Национальный архив Республики Беларусь. – Ф. 129. – оп. 2. – Д. 48.
3. Протоколы технического совещания при управлении Западного таможенного округа (4 февраля – 28 декабря 1923 г.) // Национальный архив Республики Беларусь. – Ф. 129. – оп. 2. – Д. 48.
4. Переписка с таможнями о командировании на курсы по изучению таможенного дела (1 февраля – 9 ноября 1923 г.) // Национальный архив Республики Беларусь. – Ф. 129. – оп. 2. – Д. 80.
5. Сиротский, А. Специалистов таможенного дела готовит БГУ / А. Сиротский // Таможенный вестник. – 1998. – №1. – С. 16–18.
6. Сиротский, А. Специалистов таможенного дела готовит БГУ / А. Сиротский // Таможенный вестник. – 1998. – №1. – С. 16–18.
7. Белорусский государственный университет. Факультет международных отношений. 1995–2000. Минск, 2000. – 40 с.
8. Праздник кафедры таможенного дела https://fir.bsu.by/ru/news/news2015/news-2015-11-06 Дата доступа 20 февраля 2019 г.
9. Профессия таможенник: история и современность http://www.inst.customs.gov.by/ru/inst-news-ru/view/professija-tamozhennik-istorija-i-sovremennost-8771/ Дата доступа 21 февраля 2019 г.



**Бируля Ирина Анатольевна, Молофеев Вячеслав Михайлович**

*Белорусский государственный университет (Минск, Беларусь)*


## РОЛЬ И МЕСТО ПОДГОТОВИТЕЛЬНОГО ОТДЕЛЕНИЯ В СИСТЕМЕ УНИВЕРСИТЕТСКОГО ОБРАЗОВАНИЯ

Модернизация процесса образования и обеспечение качественной подготовки специалистов высокого уровня – самые важные из задач национальной образовательной системы, предусматривающей необходимость поиска новых средств к привлечению в учреждения высшего образования не только талантливой, но и мотивированной молодежи, способной стать впоследствии высококвалифицированным специалистом. Одним из составляющих этой системы является довузовское обучение, которое зарекомендовало себя как эффективная и действенная